*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*
Якуб Колас

**№ 116 (698)**
Аўторак, 29 чэрвеня 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

# Народная Воля

Кошт: у кіёсках і крамах — 20000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.



Откровенно

## Каждый платит по своим счетам

### С Владимиром Некляевым беседует Семен Букчин

*17 июня в Варшаве во время встречи с журналистами председатель Союза белорусских писателей В.П.Некляев заявил о своем намерении остаться на Западе. Спустя несколько дней состоялась эта беседа.*

**— Надеюсь, тебе понятно, какую волну разных толков вызвало твое заявление. Уже в первых откликах прессы, во всяком случае, независимой, сквозит определенное недоумение: такой бесконфликтный и даже вполне лояльный по отношению к власти человек — и вот такое неожиданное решение... Мы как-то уже привыкли к тому, что мир современной белорусской культуры по отношению к нынешнему режиму, условно говоря, делится как бы на три части. Первая представлена радикально настроенной интеллигенцией, на дух не переносящей власть Лукашенко и открыто протестующей, в том числе и через участие в политической деятельности. Вторую можно охарактеризовать как группу умеренной критики, которая избегает политических мотивов, но с болью говорит и пишет об открытом пренебрежении "верхов" национальными ценностями, белорусским языком, об утрате Беларусью своего национального облика. И, наконец, третий слой, кстати, довольно разнообразный, ибо в нем и циничные приспособленцы, и выжидающие молчальники, и люди, все еще надеющиеся на возможность какого-то полезного сотрудничества с властью. По моему разумению, ты явно принадлежишь к третьей группе. Ну а уж насчет оттенков... Одним словом, многие сегодня задают вопрос: почему вполне благополучный литературный функционер, редактор журнала и белорусской писательской газеты, затем руководитель Союза писателей, известный поэт, в советские времена увенчанный премией Ленинского комсомола, а совсем недавно получивший Государственную премию из рук Лукашенко, решился на такой поступок? Тем более что многое в нашей нынешней жизни уже давно было более чем понятно, я имею в виду и отношение власти ко всему белорусскому, и наше абсолютное бесправие, и полное попрание элементарной демократии, и жесточайшие преследования осмеливающихся открыто высказывать свое несогласие с режимом, неправедные суды, тюрьмы с политзаключенными, которых представляют как уголовников, наконец, таинственные исчезновения известных людей, пришедших в столкновение с режимом... А ты, получается, только сейчас все это увидел?**

— Мне и самому в этом не просто разобраться... Вдруг к горлу подошло — все, хватит, больше не могу... Хотя я никогда не был человеком борьбы, человеком каких-то революционных порывов. Есть люди, чувствующие себя комфортно в борьбе, на митинге, в политике. Я не из их числа. Еще во времена перестройки, когда поднималась волна белорусского возрождения, мне приходилось и выступать, и писать на эту тему, но постоянно присутствовало чувство, что политика — это напрочь не мое. Может, потому, что я больше эволюционный, нежели революционный человек. Когда Лукашенко пришел к власти, мне казалось, что не все еще безнадежно, можно будет что-то полезное делать для нашей культуры. В этом меня убеждало и его окружение, в котором я видел достаточно приличных людей, таких как Виктор Гончар, Дмитрий Булахов, Анатолий Лебедько...

**— Но они ведь уже давно в оппозиции. Не год и не два...**

— Они открыто занимались политикой, а не литературой. В этом существенная разница. Да, крах ожиданий, связанных с приходом Лукашенко, произошел не сегодня. И не сегодня перед многими людьми встала проблема выбора. Я понял, что эта власть отнюдь не временная, хотя многие бегали с флагами и кричали, что она вот-вот падет. Наше поколение формировалось в советские, как теперь говорят, тоталитарные времена. Но, как ни странно, тогда существовало то, что называется культурой. Существовала литература, то, чем я, как и ты, напрямую занимался. Я никогда не смогу забыть переполненные залы, стадионы, куда люди приходили, чтобы слушать стихи. Я убеждал себя, что мое дело — созидать, разрушителей и без меня хватит. Одним словом, я понял, что кто-то должен всерьез заниматься нашей культурой...

**— Ты решил вернуть времена массовых поэтических вечеров? Но ведь на дворе давно другая погода.**

— Я не так наивен. Конечно, времена переменились. Но не всем же идти в политику, в революцию! Кто-то должен был заниматься и своим профессиональным делом, помогать выжить белорусской литературе, нашему языку в этих кошмарных условиях.

**— Но чтобы осуществить это — нужно изменить условия! Другого пути нет. Вещь, казалось бы, очевидная...**

— В том-то и дело, что мне пришлось на собственном опыте убедиться, что означает включение национальной культуры, национального языка в сферу антинациональной по сути политики. Я никогда не думал, что водораздел у нас дойдет до того, что само пользование белорусским языком уже будет означать твою принадлежность к оппозиции. И я, может быть, чересчур самонадеянно решил, что вот таким крепким ребятам, как, скажем, тот же Гончар, не удалось повлиять на власть, а у меня получится. Эту линию — отстаивания интересов нашей национальной культуры — я проводил, когда был редактором журнала "Крыніца", а затем одновременно и редактором газеты "Літаратура і мастацтва". Естественно, мне пришлось пойти на достаточно тесные контакты с властью, поскольку у нас приватизация в сфере прессы не состоялась, и ранее выходившие газеты и журналы по-прежнему состояли на государственной дотации.

**— Но одно дело быть редактором журнала и газеты и совсем другое — стать председателем Союза писателей. Произошло это года полтора назад... Учитывая наши традиции, ты оказался вроде как в кресле министра по делам литературы.**

— Знаешь, если бы дело происходило лет десять назад, я бы с тобой согласился. Тогда все проводилось в согласии с ЦК КПБ, должность эту сопровождала необходимая атрибутика. Сегодня писательский союз — действительно общественная организация.

**— Но власть-то нынешняя эту старую привязку понимает не меньше, чем прежняя. А, может, даже и больше, поскольку она дает деньги на содержание хотя бы аппарата союза.**

— Да, здесь нас, конечно, особенно крепко привязали после того, как отняли собственность, я имею в виду прежде всего наш Дом литератора. Аренда его помещений давала Союзу писателей средства, и можно было как-то существовать. Тем не менее на союз многие продолжали надеяться, особенно старые литераторы. Ведь случалось, что и похоронить человека было не на что... И приходили, и просили... А что мы могли? Сброситься на венок? И нужно было эти проблемы решать. Но это, скажем так, материальный ряд. Гораздо существеннее то, что происходило с национальной культурой и чему нужно было противостоять. Ну представь себе, что на встрече президента с писателями сотрудники администрации поставили таблички с нашими фамилиями, написанными по-русски. В общем, эта тенденция — выживания, вытеснения белорусского языка — стала открыто превращаться в государственную политику.

**— Но когда ты пришел на должность руководителя союза, эта политика была уже, что называется, в самом расцвете. Все акценты были расставлены. И на что ты, собственно, надеялся? Ты собирался всерьез развернуть эту махину в обратном направлении?**

— Во всяком случае, мне хотелось замедлить эти процессы. И что-то сделать удалось. Может быть, если бы не определенные усилия со стороны союза, то уже сегодня школьники изучали бы белорусский язык как иностранный. И тогда вообще вопрос с белорусской литературой в школах был бы закрыт. Да, мы посвоему воздействовали на Министерство культуры, на Министерство образования, объясняли, спорили, доказывали...

**— И что — ваши оппоненты были так сговорчивы?**

— Мне казалось, что если подвинуть в сторону такого главного антибелоруса в ближайшем окружении Лукашенко, каким является вице-премьер Владимир Заметалин, то многое у нас может получиться. Для начала решил выяснить прочность его положения. Дело в том, что Заметалина многие из окружения президента, в правительстве, мягко говоря, не любят. И год назад, уже будучи председателем Союза писателей, я решил выступить на парламентских слушаниях по культуре, где присутствовало руководство страны, и откровенно рассказать о механизмах антибелорусской политики, которые запускает Заметалин. Решение базировалось именно на том факте, что многие из белорусского руководства при встречах со мной открыто выражали свое презрение по отношению к этому "архирусскому" деятелю. Но после выступления выяснилось, что одно дело сочувственно пожимать руку в кулуарах и совсем другое — выразить открытую поддержку. Чиновники знали, что за спиной Заметалина стоит Лукашенко и поостереглись поддержать меня. С этого времени началось наше открытое противостояние, мое и Заметалина как вице-премьера, курирующего вопросы культуры. Тут-то я и ощутил всю силу машины авторитарной власти, ее возможности давить и уничтожать. Оставался один выход — обращение к президенту. И в августе прошлого года состоялась памятная многим встреча президента с правлением Союза писателей. То, что Лукашенко не намерен сдавать Заметалина, обнаружилось сразу же в реакции президента на выступление Геннадия Буравкина, который в достаточно резкой форме обрисовал положение национальной культуры и мрачную роль в ее нынешней судьбе полковника Заметалина. Лукашенко в ответ заявил, что Заметалин ему нужен "для равновесия". Собственно, тогда-то и стало ясно, что больше рассчитывать не на что и не на кого.

**— Ну, и следующим этапом развития конфликта, видимо, стало заявление правления Союза писателей в январе этого года, осуждающее президентский курс на объединение Беларуси с Россией в одно государство.**

— Реакция на это заявление со стороны власти была особенно болезненной.

**— Еще бы! Коллективка!**

— Что ты имеешь в виду?

**— Видишь, как ты далек был от советских реалий. Одно дело — индивидуальное выступление наперекор системе и совсем другое — коллективка, текст, под которым стоит несколько подписей. Коллективка всегда расценивалась советской властью или, как у нас говорят, органами как более серьезное прегрешение. А в Беларуси среди прочих сохранилась и эта традиция... Ты организовал коллективку...**

— Скорее, я поддержал ее. Но, повторяю, реакция была очень острой. Буквально через неделю Лукашенко на совещании президентской "вертикали" уже грозил в свойственном ему духе: "Мы с этими писателями еще разберемся!" Но могли ли мы в Союзе писателей промолчать, когда каждому нормальному человеку ясно, что Союз Беларуси и России, как его ни подавай, — федерация, конфедерация, по сути означает поглощение Беларуси Россией.

*(Окончание на 2-й стр.)*

## На думку аднаго з лідэраў ПКБ А.Лашкевіча, канфрантацыя ў беларускім грамадстве пасля заканчэння 20 ліпеня тэрміну паўнамоцтваў прэзідэнта можа прывесці да кровапраліцця

На думку сакратара Партыі камуністаў беларускай Анатоля Лашкевіча, пасля 20 ліпеня г.г., калі заканчваецца тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі, кіраўнік дзяржавы павінен быў бы "прызначыць выбары і выбірацца па-новаму". Аднак, перакананы лідэр ПКБ, Лукашэнка гэтага не зробіць, у сувязі з чым "можа наступіць канфрантацыя" — "нейкая частка насельніцтва, якая жыве сумленна, будзе патрабаваць аднаго, а ён будзе прымушаць людзей, якія яму падпарадкоўваюцца, рабіць другое". Усё гэта можа прывесці да кровапраліцця, — заключае А.Лашкевіч у сваім інтэрв'ю апазіцыйнай газеце "Навіны" ад 25 чэрвеня г.г.

Два гады таму Анатоль Лашкевіч змушаны быў пакінуць Беларусь, дзе, па ягоным прызнанні, улады стварылі яму ўмовы, у якіх ён не мог "ні працаваць, ні чымсьці займацца", разгарнулі супраць яго "кампанію шальмавання", арганізавалі "праслухоўванне, сачэнне, вонкавае назіранне". Сёння А.Лашкевіч узначальвае маскоўскае ВА "Рубін", якое займаецца выпускам тэлевізараў, з'яўляецца членам Каардынацыйнага савета вытворцаў Расіі і Беларусі і адначасова не спыняе сувязі з ПКБ.

Гаворачы аб развіцці беларуска-расійскіх адносінаў, Анатоль Лашкевіч выказаў меркаванне аб тым, што да прэзідэнцкіх выбараў у Расіі рэальных крокаў па паглыбленні інтэграцыі не адбудзецца. Хаця, лічыць ён, "стратэгічна Расія будзе Беларусь трымаць ля сябе. І шукаць шляхі, каб на чале дзяржавы стаялі людзі, якія б да Расіі ставіліся, гэтак мовіць, лаяльна". Лідэр ПКБ запэўніў, што ён — не супраць саюза дзвюх дзяржаў, але пры гэтым "Беларусь усё роўна павінна заставацца самастойнай дзяржавай, дэлегіраваўшы шэраг паўнамоцтваў саюзным органам".

**Юрый КУЗНЯЦОЎ, БелаПАН.**

Слышали?

## Андрей Санников встретился с Андерсом Джонсоном и Кристиной Пента

На минувшей неделе координатор Хартии'97 по международным связям Андрей Санников встретился с Генеральным секретарем Межпарламентского союза г-ном Андерсом Джонсоном.

Состоялась продолжительная и плодотворная беседа о ситуации в Беларуси. Обсуждались последние события в Беларуси, арест Михаила Чигиря, исчезновение Юрия Захаренко. Андрей Санников подробно рассказал Генеральному секретарю МПС о положении депутатов Верховного Совета Беларуси, о тех преследованиях, которым они подвергаются, в том числе и о разгоне ОМОНом собрания депутатов 23 июня. Г-н Джонсон был проинформирован о том, что 20 июля, в соответствии с Конституцией 1994 года, заканчивается срок полномочий белорусского президента.

Кроме того, в этот же день Санников встретился с заместителем Генерального секретаря МПС г-жой Кристиной Пента, которая также проявила интерес к событиям в Беларуси.

**Пресс-центр Хартии'97.**

## У выніку надзвычайнага здарэння на Абуз-Лясноўскім палігоне пацярпелі 18 ваеннаслужачых

Надзвычайнае здарэнне здарылася раніцай 25 чэрвеня на Абуз-Лясноўскім палігоне ў Брэсцкай вобласці. Як стала вядома БелаПАН, падчас расчысткі лесу групай ваеннаслужачых былі знойдзены тры неразарваныя снарады. Пры спробе закапаць іх выпадкова быў нанесены ўдар штыком рыдлёўкі па снарадзе, у выніку чаго і адбыўся выбух. Паранены 18 ваеннаслужачых, двое з якіх знаходзяцца ў цяжкім стане.

**Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.**

## Савет Еўропы прыняў рэзалюцыю па Косава

Пасля цэлага дня дэбатаў Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ) прыняла рэзалюцыю па Косава.

Парламенцкая Асамблея заклікала Савет Еўропы адыграваць першую ролю ў рэканструкцыі разбуранага Косаўскім крызісам рэгіёна. У рэзалюцыі адзначаецца, што Савет Еўропы павінен шчыльна супрацоўнічаць з часовай адміністрацыяй ААН ў Косава. ПАСЕ прыгадала, што кампетэнцыя Савета Еўропы робіць яго прывілеграваным партнёрам у вобласці абароны правоў чалавека, пасрэдніцкіх дыпламатычных паслуг, развіцці палітычных партый і прызначэнні суддзяў. У рэзалюцыі падкрэсліваецца, што Савет Еўропы павінен распрацаваць свой уласны Пакт стабільнасці на Балканах, у тым ліку і адкрыццё тэлерадыёстанцыі ў Прышціне і Бялградзе.

Рэзалюцыя адзначае, што Савет Еўропы мусіць аказаць значную фінансавую дапамогу Найвышэйшаму камісарыяту па справах уцекачоў і іншым арганізацыям, што займаюцца ўцекачамі. ПАСЕ заклікала Савет Еўропы ўнесці свой удзел у рэформу школьных праграм і сістэмы школьнай адукацыі ў Косава.

Парламенцкая Асамблея таксама адзначыла неабходнасць сапраўдных рэформ у Югаславіі, каб гарантаваць стабільнасць у рэгіёне. Але з другога боку яны не могуць ажыццявіцца, пакуль Мілошавіч ды іншыя ваенныя злачынцы захоўваюць уладу, — гаворыцца ў рэзалюцыі. Што датычыцца Косаўскай вызваленчай арміі, то ПАСЕ заклікала яе выконваць дасягнутае з КФОР пагадненне па раззбраенні і ўстрымацца ад помсты.

**Максім ПЯТРОЎСКІ,**
**уласны карэспандэнт "Народнай волі".**

Страсбург.

## Чрезвычайные происшествия в Жлобине продолжаются. Погибли люди

Прошла неделя после вооруженного "захвата" спецподразделением "Алмаз" генерального директора БМЗ Юрия Феоктистова. Шум на весь город, вызванный арестом, сменился практически полным молчанием о причинах лишения свободы известного далеко за пределами страны человека.

Заместитель генерального директора БМЗ по информации Николай Аксенов на вопрос о причинах ареста ответил, что и он, и весь многотысячный коллектив завода находятся в полном неведении. До сих пор ни правоохранительные органы, ни Министерство промышленности какого-либо объяснения происходящему не дали.

Из других источников удалось выяснить, что расследуются эпизоды пятилетней давности. В 1994 году, в условиях хаоса в экономике на просторах СНГ, завод производил взаиморасчеты через Прибалтику, где в то время были самые устойчивые финансовые организации. Подтверждением этому является то, что допрашиваются в основном те лица, которые в той или иной степени были причастны к тогдашним операциям. Юридический отдел завода уже передал правоохранительным органам все договоры того периода.

К сожалению, беда не приходит одна. В пятницу по дороге на завод погибли двое наших коллег из журнала "Дело": Равиля Аглетдинова и Вадим Пецевич, направлявшиеся по заданию редакции на металлургический завод. У самого Жлобина, возле поворота на Светлогорск, их машину вынесло на встречную полосу, по которой в это время двигался БелАЗ, принадлежащий БМЗ. Смерть наступила на месте происшествия.

Редакция "Народной воли" выражает соболезнование коллективу журнала "Дело", родным и близким Равели Аглетдиновой и Вадима Пецевича по поводу их трагической гибели.

**Никита ПИГУЛЬ.**

Віншуем!

## Таварыству беларускай мовы імя Францішка Скарыны – 10 год

Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны ўтварылася ў 1989 годзе як рэспубліканская грамадская арганізацыя.

На працягу сямі гадоў Таварыства ўзначальваў народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. З 1997-га паэт Генадзь Бураўкін. 17 красавіка 1999 года VI з'езд абраў старшынёй Алега Трусава.

Найвышэйшай мэтай стварэння і сэнсам дзейнасці Таварыства з'яўляецца аднаўленне ў грамадстве стаўлення да роднай мовы як да нацыянальнай святыні, адраджэнне на гэтай падставе гістарычнай памяці, традыцыйнай культуры нашага народа.

Пры ТБМ дзейнічае 9 камісій: арганізацыйна-прапагандысцкая, адукацыйная, тэрміналагічная, па культуры мовы і ўдасканаленні правапісу, па тапаніміцы і гістарычнай сімволіцы, па моўных скарбах, па зрокавым і гукавым афармленні жыццёвага асяроддзя, па сувязях за межамі краіны, выдавецкая. Структуры ТБМ працуюць у 110 населеных пунктах Беларусі, а таксама ў Маскве, Іркуцку, Вільні, Пецярбургу, Рызе, Ялце, Алма-Аты.

За дзесяць гадоў працы арганізацыя правяла вялікую работу па адраджэнні беларускай мовы ў дзяржаўным, грамадскім і духоўным жыцці народа. Нядаўна "старонка ТБМ" з'явілася ў віртуальнай прасторы Інтэрнэта. У бліжэйшы час яна будзе перакладзена на англійскую, рускую і іншыя замежныя мовы.

Рэдакцыя "Народнай волі" (дзе, дарэчы, створана суполка ТБМ), шчыра віншуе сяброў і прыхільнікаў Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны з 10-годдзем і зычыць багатага плёну ў высакароднай дзейнасці на ніве нашай духоўнасці.

Стоп-кадр

"Народная воля" уже рассказывала о том, как милиция с омоновцами разгоняла собрание депутатов Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва. Но вот на редакционном столе появился еще один снимок.

Сотрудники милиции требуют у официантки позвать директора ресторана "Новолуние", в котором депутаты оппозиционной части Верховного Совета решили провести совещание (на заднем плане) в Минске 23 июня 1999 года. Чуть позже сотрудниками милиции была предпринята попытка срыва данного мероприятия под видом поиска бомбы, якобы заложенной в помещении ресторана. Несмотря на возможную опасность, жильцы из квартир дома, где расположен ресторан, эвакуированы не были.

Что ж, посмотрят когда-нибудь потомки на этот снимок и подумают: странные вещи происходили когда-то на Беларуси.

**Фото IREX/ProMedia.**

Запрашаем у вандроўку

## Да нас едуць беларусы свету

Вы не ведаеце, хто такія саўтрыверцы і нават не чулі пра слаўны беларускі горад Саўт-Рывер? Сапраўды, такога паселішча вы не знойдзеце нават на самай дакладнай і падрабязнай карце Беларусі. Бо знаходзіцца гэты горад у Злучаных Штатах Амерыкі.

Саўт-Рывер — адзін з самых прыкметных і выразных беларускамоўных гарадоў. Тут жыве вельмі шмат беларусаў, ды не такіх, што пра сваю нацыянальную прыналежнасць згадваюць толькі тады, калі неабходна падаць пашпартныя звесткі. У саўтрыверцаў беларускасць ёсць арганічная сутнасць характару і душы. Душа ж, як вядома, без мовы не бывае, яна яе своеасаблівая апратка, па якой беспамылкова пазнаецца прадстаўнік кожнага народа.

Саўт-Рывер на мове індзейцаў, колішніх насельнікаў і гаспадароў тамтэйшых мясцінаў, абазначае Жывая вада. Але там цяпер індзейцаў няма. Перавяліся. Калі больш дакладна — іх проста фізічна вынішчылі, маральна і псіхалагічна як этнас апустошылі і рознымі спакусамі, найбольш гарэлкай, абязволілі, пазбавілі пачуцця ўсякай нацыянальнай годнасці і здольнасці да выжывання белыя прышэльцы некалькі стагоддзяў назад. І народ з гаспадара ператварылі ў нікчэмнага раба-жабрака на ўласнай зямлі. Ці ж не паказальны і не павучальны прыклад для ўсіх, хто цешыць сябе марнай, і амаральнай таксама, надзеяй збудаваць сваё шчасце з дапамогай так званых "старэйшых братоў"?..

Але да тых далёкіх гістарычных закалотаў сённяшнія жыхары Саўт-Рывера дачыненняў не маюць. Насяляюць гэтую прыгожую мясціну на беразе аднайменнай з горадам ракі ў перадгор'ях у асноўным нашчадкі пазнейшых на амерыканскай зямлі хваляў эміграцыі, першая з якой прыпадае на другую палову XIX стагоддзя, калі жыхары Беларусі пасля жорсткага падаўлення антырускіх паўстанняў ратаваліся дзе хто мог. Другая хваля новай эміграцыі хлынула сюды ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе з Заходняй Еўропы. Потым аж да гарбачоўвай "перастройкі" славянскага прытоку сюды амаль не было, а з Беларусі ўвогуле нікога лёс не закінуў у той далёкі заакіянскі куток. Але сітуацыя з пачатку дзевяностых гадоў істотна памянялася. Цяпер гусцейшымі чародкамі і паасобку залятаюць сюды "пералётныя птушкі" — людзі з Беларусі. Адны, каб пабыць-пажыраваць на два бакі мазаным амерыканскім хлебе, іншыя, як вядомы кампазітар Зміцер Еўтуховіч, асталявацца тут, бадай што, надоўга. Спрыяе гэтаму зычлівае стаўленне да землякоў-вандроўнікаў беларускай грамады, з'яднанай у Беларуска-амерыканскі культурны цэнтр, прэзідэнтам якога на працягу апошняга часу нязменна абіраецца Юра Навумчык. Цэнтр як грамадская структура належыць да больш шырокага аб'яднання — Беларуска-Амерыканскага кангрэсавага камітэта, якім з далёкіх пасляваенных гадоў таксама нязменна кіруе вельмі аўтарытэтны на агульнаамерыканскім грамадскім і палітычным абсягу Расціслаў Завістовіч, які апрача гэтага апошнім часам яшчэ ўзначальвае і грамадскі камітэт па справах этнасу пры Кангрэсе Злучаных Штатаў Амерыкі. А ЗША, не будзем забывацца, — краіна эмігрантаў.

Едуць да нас нашы суродзічы, праваслаўныя вернікі, якія ўсёй сваёй беларускай сутнасцю сцвярджаюць, што праваслаўе — арганічная і спрадвечная для беларуса вера. Але, будучы праваслаўнымі, трэба памятаць, што мы найперш хрысціяне, што падзел паміж хрысціянскімі веравызнаннямі — справа другарадная і ў прынцыпе малаістотная. А таму побач з праваслаўнымі святынямі ўдзельнікі вандроўкі падчас маршруту будуць наведваць і ўсе ацалелыя каталіцкія касцёлы, і кляштары, якія безумоўна маюць культурна-гістарычную каштоўнасць ці культавую значнасць. Гэтае паломніцтва пачнецца са старажытнага Полацка, з яго старажытных храмаў, найперш, царквы Святой Еўфрасінні Полацкай — нябеснай заступніцы беларускага народа. Пабачаць яны тут і пераствораны мастаком Міколам Кузьмічом Крыж Лазара Богшы, які ўвогуле выстаўляецца на народнае агляданне толькі па святочных днях, але ў гэтым выпадку па ўзгодненасці з рэлігійнымі ўладамі будзе зроблена выключэнне.

З Полацка дарога пабяжыць на Оршу — радзіму легенды навага часу Уладзіміра Караткевіча і горад з вялікімі гістарычнымі традыцыямі. Пабудзем і на недалёкім адсюль Крапівінскім полі, асвечаным слаўнай перамогай беларускага войска на чале з польскім гетманам Канстанцінам Астрожскім. Экскурсію правядзе, падмацоўваючы аповед песнямі пад гітару, наш слынны бард Андрэй Мельнікаў. Завязе ён вандроўцаў і ў вёску Бобр, дзе цяпер жыве на лецішчы слынны беларускі мастак Алесь Пушкін, які вельмі цікава размаляваў тутэйшую царкву, бадай, адзіную ў Беларусі, збудаваную на сабраныя людскія грошы.

Увогуле ж галоўным вандроўцам у гэтай паездцы будзе прафесіянал высокага класа Ігар Гатальскі, які абхадзіў і аб'ездзіў Беларусь на роверы і аўтамабілі ўздоўж і ўпоперак, ведае, што ёсць цікавага паказаць, а таксама расказаць пра тое, што было ў нашай "краіне замкаў" у старажытнасці, але загінула ў цяжкіх ліхалеццях і закалотах. На шляху, апрача названых, будуць такія гарады, як Магілёў, Мсціслаў, Гомель, Рэчыца, а таксама менш значныя, але пасвойму не менш цікавыя, як Ветка з яе унікальным музеем. Будуць і сустрэчы з Асобамі на Беларусі, з вядомымі мастацкімі калектывамі. Карацей кажучы, ставіцца задача паказаць тое, што і робіць Беларусь Беларуссю як спадкаемцу некалі магутнай еўрапейскай дзяржавы з межамі ад Балтыйскага да Чорнага мора, з высокаразвітай духоўнай і матэрыяльнай культурай.

Напрыканцы інфармацыя: ***у нашым камфартабельным аўтобусе ёсць некалькі вакантных месцаў. Ласкава прапануем далучыцца тым, хто жадае падзяліць радасць сустрэч з мінулым і цяперашнім роднага краю, хто прызнае сябе патрыётам Беларусі, прызнае яе мову і культуру, а значыць, арганічна ўвальецца ў нашу няхай часовую, але роднасна нязменную беларускую супольнасць. Сваё жаданне можна перасказаць па тэлефоне ці даслаць на факс пад нумарам 213-05-44. Адказны за вандроўку Яўген Лецка. Спяшайцеся, бо часу мала. Ад'езд 30 чэрвеня ў 8.00 ад гатэля "Беларусь". Вяртаемся ў Мінск вечарам 4 ліпеня.***

**Яўген ЛЕЦКА.**

## Названы імёны пераможцаў конкурсу на лепшую песню пра Мінск

Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу "Дом мой — сталіца" на лепшую песню пра Мінск, які праводзіўся Беларускім саюзам кампазітараў і Беларускім аўтарскім фондам кампазітараў пры падтрымцы шэрагу дзяржаўных арганізацый. Удзел у конкурсе ўзялі больш за трыццаць прафесійных і самадзейных кампазітараў, прычым большасць конкурсных песень яшчэ нідзе не выконвалася.

Журы пад старшынствам народнага артыста Беларусі кампазітара Валерыя Іванова вырашыла не прысуджаць першую прэмію. Другую атрымалі кампазітар У.Карызна і паэт Я.Стяцко, трэцюю — кампазітар Д.Далгалёў і паэт М.Пецюкевіч. Былі прысуджаны яшчэ тры заахвочвальныя прэміі, а таксама адзначана работа непрафесійнага кампазітара Івана Олешкі — жыхара горада Смалявічы (Мінская вобласць).

15 ліпеня ў Мінску пройдзе заключны гала-канцэрт конкурсу, дзе будуць прадстаўлены песні-прызёры і іншыя ўдзельнікі конкурснай праграмы. Цікава, што ў творчым багажы беларускіх кампазітараў ёсць песні не толькі пра сталіцу, але і пра асобныя яе раёны і памятныя месцы.

Да дня гала-канцэрта Беларусі аўтарскі фонд кампазітараў сумесна з Мінгарвыканкамам мае намер выпусціць аўдыёкасету з лепшымі песнямі пра сталіцу Беларусі. На думку старшыні фонду Сяргея Салохіна, касета зможа добра прадстаўляць горад у замежных паездках мінскіх афіцыйных дэлегацый.

**Марына КУНОЎСКАЯ, БелаПАН.**

## Невядомымі атручана возера ў брэсцкім гарадскім парку культуры і адпачынку

Невядомымі атручана возера, размешчанае ў гарадскім парку культуры і адпачынку Брэста. Адным з першых звярнуў увагу на серавадародны смурод, які распаўсюдзіўся па ўсім наваколлі, начальнік эксплуатацыйна-гаспадарчага ўчастку парку. Маляўнічае возера, адлюстраванае многімі брэсцкімі мастакамі, — неглыбокае, вада тут заўсёды была празрыстай. Сёння ж яна набыла грязна-белы малочны колер; загінула ўся рыба; яд, па ўсёй бачнасці, такі таксічны, што чайкі, хапаючы рыбу, тут жа выкідваюць яе назад.

Санітарныя службы горада, эколагі і міліцыя, прыбыўшыя на месца здарэння, пакуль нічога, акрамя меркаванняў, сказаць не могуць. Узятыя на аналіз пробы глею, вады, водарасцяў і рыбы будуць гатовы не раней за аўторак. Гэта значыць, што нейтралізаваць дзеянне яду зараз немагчыма, паколькі невядома, чым атручана вада. Па адной з версій, вадаём забруджаны каналізацыйнымі выкідамі; па другой — атручаны рыбаком-"хімікам", які спрабаваў незаконным спосабам лавіць рыбу; па трэцяй — у выніку спёкі ў возеры пачалі гнісці мікраарганізмы і водарасці, і ад недахопу кіслароду загінула рыба.

**Валянціна КАЗЛОВІЧ, БелаПАН.**

**30 чэрвеня — планавы нявыхад "Народнай волі". Наступны нумар газеты выйдзе ў чацвер, 1 ліпеня 1999 года.**

Пр. Ціхана.
К. Апосталаў Святых Пятра і Паўла.

ЧЭРВЕНЬ
**29**
'99 АЎТОРАК

| ☉ | ○ |
|---|---|
| Усход 4.41 | Поўня |
| Захад 21.46 | 0.38 |
| Даўж. дня 17.05 | Захад 6.15 |
| | Усход 23.04 |

Откровенно

# Каждый платит по своим счетам

*(Окончание. Начало на 1-й стр.)*

**— Выходит, жизнь заставила тебя, человека, сторонившегося политики, занять вполне определенную политическую позицию.**

— Видишь ли, мне выпала такая карта — стать белорусским поэтом. Хотя иной раз думалось, что, может, лучше было бы быть поэтом китайским или японским. Помнишь, у Андерсена одна из сказок начинается так: "В Японии, дружок, живут японцы и император у них японский..." Или это он про китайцев... Но и с китайцами все ясно и понятно. А у нас — кто живет и кто император? Во всяком случае, государственная политика не свидетельствует о том, что дело происходит в Беларуси. Об этом мы и сказали. Ну и власть, соответственно, отреагировала. Не могли нам простить того, что после той самой встречи с президентом, где, несмотря на явные противоречия, внешне было достигнуто какое-то соглашение, по крайней мере, по вопросам материального порядка, после того, как председатель союза получил госпремию, произошел такой вот бунт на корабле. Ну, а какое у нас обычно следует наказание? Открыто по политическим мотивам у нас еще не сажают. Начинаются финансовые проверки, надо человека подвести под статью, дабы показать всем, что бунтует не человек, у которого есть свои взгляды, а уголовник. Стали трясти журнал "Крыніца", комиссии из самых разных органов — Комитета государственного контроля, КРУ, налоговой инспекции, Комитета по печати...

**— Тебе, как редактору, представили акт проверки с указанием каких-то нарушений, злоупотреблений?**

— Был такой акт, но я его не подписывал, да и не мог этого сделать, поскольку к тому времени Комитет по печати не заключил со мной контракт как с главным редактором журнала, к тому же во время проверок я находился в больнице.

**— Но какие-то нарушения были зафиксированы проверяющими?**

— Ну, а как ты думаешь: для чего они пришли? Да еще такой серьезной компанией... Ну зафиксировали, что я, как редактор, какое-то время получал зарплату и в "Крыніце" и в газете "Літаратура і мастацтва". Хотя, в общем, это совмещение было согласовано. Предъявили претензии к выплатам гонорара, к ценам на бумагу и полиграфию... Но этого оказалось недостаточно. Поэтому проверки идут и по сей день.

**— Можно ли сказать, что на сегодняшний день власти в Минске располагают каким-то документом, в котором лично к тебе предъявляются определенные финансовые претензии?**

— Не сомневаюсь в этом.

**— Ты можешь сказать, о каких суммах идет речь?**

— Нет, потому что я не видел этого документа. Мне его не показали.

**— Откуда же тогда известно, что тебя обвиняют в каких-то злоупотреблениях?**

— Мне постоянно поступали сигналы, что вот, мол, погоди, еще немного — и тебя накроют. Все это тянулось четыре месяца... Можно подумать, что это какое-то крупное предприятие, а не редакция из пятнадцати человек. Наконец, перед моим отпуском очередные проверяющие обнаружили, что в редакции на двери специальной комнаты, где хранились документы, сорвана пломба, а бумаги исчезли. Встал вопрос: кому нужно было похищать уже отработанные, скопированные и вошедшие в материалы проверки документы? Я поинтересовался у компетентных людей по поводу того, что бы это могло означать. Мне сказали: вот тебя-то сейчас и обвинят в хищении этих документов. Соответственно, могут теперь обвинить и в каких угодно злоупотреблениях. Такая модель, оказывается, уже давно отработана на практике. Это случилось около месяца назад.

**— Короче, засветила тюрьма... У тебя уже тогда зароились мысли о том, что, если не хочешь разделить судьбу Старовойтова, Климова, Чигиря, нужно оставить страну, попросту говоря, бежать из нее?**

— Нет, о бегстве из Беларуси я вообще не думал. И когда уезжал в Польшу, не думал об эмиграции. Хотя рано утром ко мне пришел человек, располагающий более чем точной информацией, и сказал: "Принято решение тебя изолировать".

**— Извини, я ничего не понимаю. Ты что, после такого известия ехал в Варшаву, за шестьсот километров, пива здешнего попить?**

— Пиво и в Минске не хуже... Но выдалась случайная возможность оказаться в безопасном месте и подумать, обмыслить, что называется, ситуацию. Ну пойми, было трудно поверить в то, что мне грозит арест. В Минске я был в таком состоянии, что уже не мог реально оценивать происходящее. Я человек неполитической биографии и свыкнуться с мыслью, что политика ворвалась в мою жизнь и переломила ее, мне до сих пор невероятно сложно. Осознание того, что это все-таки случилось, пришло здесь, в Варшаве, когда я получил подтверждение информации, что мой арест предопределен.

**— Ты пересек границу шестого июня. А когда к тебе поступила эта информация?**

— Ровно через неделю.

**— Российское агентство ИТАР-ТАСС распространило информацию, что ты попросил в Польше политическое убежище. Но, насколько мне известно, согласно польским законам, такое обращение следует сделать в течение двадцати четырех часов после пересечения границы. Ты знал об этом?**

— Знал. Но я не собирался просить политического убежища.

**— И сейчас не собираешься этого делать?**

— Сейчас это неизбежно. Я пришел к убеждению о необходимости этого шага. О возвращении домой пока не может быть и речи. Я хотя и болен, но не на голову. Винникова находилась за границей, когда было принято решение об ее аресте. Ей передали весточку: ну что ты, Тамара, мы тебя любим, ценим, ждем не дождемся, ты у нас тут кандидат в премьер-министры. Она вернулась, и теперь ее нет нигде. Нет, торги уже кончились, я сейчас плачу по собственным счетам. Разлукой с родными, с друзьями... Плачу за приближенность к власти, за иллюзии или за что-то другое, как бы оно ни называлось...Помнишь пушкинское: "Близ царя — близ смерти". Дорогой всевозможных компромиссов — больших, малых — я подошел к тому нравственному рубежу, переступить который невозможно.

**Варшава. 24 июня.**

Ведай нашых!

## Літоўцы адкрылі для сябе беларускія аўтобусы

У бліжэйшы час па вуліцах Вільнюса будзе курсіраваць гарадскі аўтобус, выраблены на Мінскім аўтазаводзе. Як паведаміў карэспандэнту БелТА намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Мікалай Пацкевіч, адпаведная дамоўленасць была дасягнута ў ходзе знаходжання ў сталіцы суседняй дзяржавы генеральнага дырэктара беларускага аўтагіганта Валянціна Гурыновіча. Кіраўнік МАЗа 22—24 чэрвеня знаходзіўся ў Літве ў складзе дэлегацыі Мінска, якую ўзначальваў мэр сталіцы Уладзімір Ярмошын.

На выпрабаванне новага для Вільнюса аўтобуса беларускай вытворчасці тут адводзяць два месяцы. Нашы вытворцы перакананы, што машына дастойна здасць экзамен, і ў хуткім часе аўтобусы з папулярнай абрэвіятурай "МАЗ" будуць курсіраваць па вуліцах не толькі ў сталіцы Літвы. А тое, што ў суседняй дзяржаве зацікавіліся мадэлямі гарадскога і прыгараднага аўтобусаў беларускай вытворчасці, пацвердзіла і выстаўка "БеларусьЭКСПО-99", дзе яны мелі, бадай, найбольшую папулярнасць у наведвальнікаў.

У час знаходжання ў Вільнюсе Валянцін Гурыновіч сустрэўся з кіраўнікамі гарадскіх і прыгарадных аўтобусных паркаў. Размова ішла аб магчымасці паставак беларускіх аўтобусаў. Было падрыхтавана дылерскае пагадненне Мінскага аўтазавода з адным з вільнюскіх прадпрыемстваў. Добрым пацвярджэннем сур'ёзнасці намераў нашых аўтавытворцаў на літоўскім рынку, а таксама зацікаўленасці суседняй дзяржавы ў набыцці прадукцыі МАЗа стала заключэнне кантракта на пастаўку чатырох беларускіх самазвалаў.

**Ігар РУБАН.**

Са скандынаўскага блакнота

*Уладзімір ШЫК*

# Белыя ночы над зямлёй "Свенскар"

### 4. Ні дня без культуры і актыўнага адпачынку

*(Праціг. Пачатак у №№ 113—115.)*

пабудаваў тры крытыя лядовыя пляцоўкі для хакейных каманд, два басейны, некалькі водналыжных клубаў, мае свой гандбольную каманду 1-й лігі, у ваколіцах — дзесяткі выдатных футбольных палёў, пляцовак для папулярнага тут гольфу.

Што важна, яны не пуставалі. Дзесьці пасля абеду і ў выхадныя паўсюдна звінелі маладыя галасы. Швецыя зараз перажывае яшчэ адно захапленне — ролікавымі канькамі і веласіпедамі. Тут ніхто не будзе здзіўляцца, калі рэспектабельны бізнесмен ці настаўнік у цёплае надвор'е прыедзе на працу ў шортах і кашулі з кароткімі рукавамі. Звычайна ў межах горада аўтамабілямі не карыстаюцца, а садзяцца на веласіпед. Для гэтай вялікай катэгорыі ўдзельнікаў дарожнага руху прадугледжаны спецыяльныя дарожкі, паўсюдна пабудавалі стаянкі для соцень педальных машын. Многія веласіпеды зроблены са спецыяльнымі ўтульнымі крэсламі для маленькіх дзетак, кошыкамі для перавозкі прадуктаў. Юныя веласіпедысты абавязаны ездзіць па дарогах у велашлемах на галаве. На поўным сур'ёзе нас папярэджвалі, каб былі ўважлівыя на вуліцы, бо няўважлівы прахожы можа трапіць пад кола веласіпедыста.

Калі мы наведвалі камунальную школу "Хагаберг", то заўважылі вакол кожнага школьнага памяшкання таксама дзесяткі прыпаркаваных веласіпедаў. Тут вучацца з 1-га па 6-ты клас трыста навучэнцаў, многія з якіх — дзеці палітэмігрантаў. Швецыя — адна з краін, дзе адсутнічаюць дзіцячыя дамы і сіроты. З моманту нараджэння да 16-гадовага ўзросту дзяржава выплачвае на кожнага дзіця, нягледзячы на даходы сям'і, штомесячную дапамогу ў 100 долараў.

Ад нашых школ "Хагаберг" адрознівалася тым, што дзеці вучыліся без абутку, у шкарпэтках, у кожным класе было па некалькі камп'ютэраў. У памяшканнях, дзе кожны клас мае свой асобны выхад на вуліцу, заўсёды цёпла і чыста, расстаўлена зручная мэбля, вышыню і размяшчэнне якой можна рэгуляваць так, як патрэбна вучню. Некалькі гадоў назад тут з'явіліся дзеці-інваліды, і таму да кожнага класа, спартзала, сталовай зрабілі спецыяльныя дарожкі для інвалідных калясак. Дарэчы, так зроблена паўсюдна па краіне, нават у тунелях пад чыгуначным палатном і ва ўваходах у царквы.

Дзень быў цёплы і сонечны, і таму многія вучні і настаўнікі апранулі шорты, выглядалі бадзёрымі, загарэлымі. Ужо хутка будзе сорак гадоў, як дзеці атрымалі права звяртацца да настаўніка на "ты", а звычайныя школьныя адзнакі замянілі тут тэстыраваннем. У канцы семестра па ўсёй краіне праводзяцца экзамены, вынікі якіх паведамляюцца вучню асобна ў прысутнасці бацькоў. Звяртаецца ўвага, над чым трэба больш працаваць. Ацэнкі ведаў такія: "залічана", "добра" і "вельмі добра". Пасля заканчэння гімназіі па выніках выпускных экзамены набіраюць студэнтаў універсітэтаў, навучанне ў якіх, у адрозненне ад школы, платнае. Каб вучыцца, можна ўзяць адпаведны крэдыт у банку, за які прыйдзецца расплачвацца ўжо пасля завяршэння вучобы.

Дарэчы, другі паверх мясцовай бібліятэкі ў Ліндэрсбергу плошчай у тысячу квадратных метраў цалкам аддадзены для папаўнення ведаў дарослых і дзяцей. Багата прадстаўлена тут даведачная і спецыяльная літаратура, а найбольш рэдкія кнігі можна заказаць па камп'ютэру з абласнога цэнтра або Стакгольма. Як расказала загадчыца гэтага Дома кніг Карын Блумквіст, ужо з 8 гадзін раніцы адчыняюцца дзверы чытальнага зала, дзе можна пазнаёміцца са зместам 430 шведскіх і замежных газет, 250 часопісаў.

Сама бібліятэка працуе штодзённа з 10 да 19 гадзін, поўнасцю камп'ютэрызавана. Апроч выдачы за невялічкую плату на прагляд 300 лепшых відэа-, кінафільмаў свету, усе астатнія паслугі, у тым ліку ксеракапіраванне, аказваюцца 10 тысячам зарэгістраваных чытачоў бясплатна. Ёсць тут 2 тысячы кніг для сляпых, літаратура з буйным шрыфтам для людзей з дрэнным зрокам, запісы на кампакт-дысках лепшых опер, сімфоній, песні, казкі арабскіх, афрыканскіх краін для палітэмігрантаў і іх дзяцей.

Па бібліятэчным камп'ютэрным архіве ў шведскай глыбінцы адшукаліся выданні беларускіх пісьменнікаў В.Быкава і У.Караткевіча. Апроч гэтага ў прасторных пакоях рэгулярна праходзяць выставы мастакоў, чытацкія канферэнцыі, а для самых маленькіх ля чароўнага дрэва на паляне казак — канцэрты, сумесныя чыткі кніг. Працуюць у бібліятэцы, уключаючы чатыры філіялы, усяго 19 работніц, гадавы бюджэт установы перавышае мільён долараў, а заробкі бібліятэкараў крыху больш за 2 тысячы долараў у месяц. Ёсць тут і свая бібліятэка-аўтобус для абслугоўвання раз у месяц аддаленых хутароў і вёсак. Штодзень абслугоўваецца 600—700 чытачоў, на дом выдаецца 500 кніг.

Апошнім часам шведы чытаюць найбольш спецыяльную, гістарычную, юрыдычную літаратуру, кнігі пра камп'ютэрныя навінкі, жанчыны — любоўныя раманы. Для пашырэння ведаў дзетак аб свеце вельмі багата прыгожа ілюстраванай літаратуры, дзе можна даведацца не толькі аб рымскай імперыі і адзенні розных эпох, але прачытаць, чаму рухнуў Савецкі Саюз. Нельга вынесці кнігу з зала цішком, бо ўсе яны "закадзіраваныя" і без рэгістрацыі ў бібліятэкара на камп'ютэры ў дзвярах прагучыць сірэна. Аб людзях клапоцяцца і, калі на вуліцы пойдзе дождж, бібліятэка бясплатна выдасць чытачу парасон. Каго цікавіць дзейнасць органаў улады, можа пачытаць свежыя рашэнні і пратаколы пасяджэнняў муніцыпалітэта. Адным словам наведвальнікі атрымоўваюць практычна ўсю неабходную інфармацыю, бо бібліятэка выкарыстоўвае і сістэму Інтэрнет.

Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, некалькі дзесяткаў тэлеканалаў турбуюць мясцовых газетчыкаў. Але статыстыка паказвае, што шведы па-ранейшаму з'яўляюцца адной з самых чытаемых нацый у свеце, а людзі давяраюць сваёй мясцовай газеце. Сёння шведская сям'я выпісвае 2—3 газеты і чытае 4—5 часопісаў. Як і ў астатніх дэмакратычных краінах Еўропы, безумоўна, забаронена афіцыйная цэнзура друку, а таксама іншыя сур'ёзныя абмежаванні для збору і распаўсюджвання друкаванай прадукцыі. Гэтага ўдалося дасягнуць з дапамогай серыі прадуманых мерапрыемстваў і законаў.

*(Заканчэнне будзе.)*

**На здымках:** *жыццё шведа з маленства нельга ўявіць без заняткаў спортам; такіх выдатных баз адпачынку некалькі толькі ў адной вобласці Эрэбру.*

## Савет міністраў Беларусі вызначыў набаўкі да службовых акладаў работнікаў кантрольна-рэвізійных службаў у памеры да 30 працэнтаў ад акладу

Як стала вядома БелаПАН, Савет міністраў Беларусі прыняў пастанову, згодна з якой работнікам кантрольна-рэвізійных службаў устаноўлены набаўкі ў памеры да 30 працэнтаў ад службовага акладу. Размова ідзе аб работніках міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, аб'яднанняў (устаноў), падпарадкаваных ураду, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, што ажыццяўляюць рэвізіі і праверкі юрыдычных асоб і іх адасобленых структурных падраздзяленняў.

Міністэрству фінансаў, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму, пачынаючы з 2000 года, пры фарміраванні адпаведных бюджэтаў даручана прадугледжваць асігнаванні на ўсталяванне ўказаных набавак.

Кіраўнікам міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, аб'яднанняў (устаноў), падпарадкаваных ураду, рэкамендавана "шырэй выкарыстоўваць права прэміравання работнікаў кантрольна-рэвізійных службаў за правядзенне кваліфікаваных і якасных рэвізій і праверак". Дадзеная пастанова ўступіла ў сілу ў чэрвені 1999 года.

**Ягор ЗВОННІКАЎ, БелаПАН.**

## Кіраўнік Магілёўскага аблвыканкама М.Дражын лічыць мэтазгодным закрываць невялікія стратныя прадпрыемствы

У Магілёўскай вобласці хуткім часам можа скараціцца колькасць перапрацоўчых прадпрыемстваў. Такую выснову можна было зрабіць пасля нядаўняга пасяджэння Магілёўскага аблвыканкама.

Падчас абмеркавання пытання аб выкананні некаторымі чыноўнікамі сваіх абавязкаў прадстаўнікоў дзяржавы ў органах кіравання адкрытых акцыянерных таварыстваў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Міхаіл Дражын выказаў меркаванне аб тым, што невялікія прадпрыемствы, якія не даюць прыбыткаў, трэба паступова закрываць. Гэтая заява, у асноўным, закранула малочныя перапрацоўчыя заводы, якія зараз працуюць на 30—40 працэнтаў ад сваёй магутнасці. На думку кіраўніка абласной "вертыкалі", цяперашнія аб'ёмы вырабляемага на Магілёўшчыне малака ў стане перапрацаваць некалькі сучасных заводаў вобласці. Што ж тычыцца мясцовых мясакамбінатаў, то ўжо не першы год з-за ўсё таго ж недахопу сыравіны вядуцца размовы аб змяншэнні іх колькасці з трох да двух. "Крайнім" можа апынуцца Крычаўскі мясакамбінат, забойны цэх якога цяпер працуе толькі 1—2 дні на тыдзень.

**Канстанцін УВАРАЎ.**

## Адкрыццё Дзён культуры Рэспублікі Беларусь у Крыме

Дні культуры Рэспублікі Беларусь пройдуць у Крыме з 3 па 7 ліпеня. Як паведаміў Крымскаму інфармацыйнаму агенцтву міністр культуры аўтаноміі Міхаіл Голубеў, 3 ліпеня вечарам у Крымскім украінскім музычным тэатры адбудзецца афіцыйнае адкрыццё Дзён, а затым будзе паказаны першы са спектакляў, прывезеных калектывам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы. Артысты гэтага тэатра будуць даваць прадстаўленні кожны вечар, па 7 ліпеня ўключна.

Сярод іншых удзельнікаў Дзён — Дзяржаўны ансамбль песні "Свята", рэжысёрска-пастановачная група "Беларусьфільма", а таксама афіцыйная дэлегацыя, у склад якой увойдзе кіраўніцтва Міністэрства культуры і Саюза пісьменнікаў Беларусі. Усяго ў свяце прымуць удзел больш як 100 беларускіх гасцей. Мерапрыемствы ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Беларусь, акрамя сталіцы аўтаноміі, пройдуць у Ялце, у вёсках Сакскага, Сімферопальскага і Красногвардзейскага раёнаў. Адбудуцца сустрэчы з прадстаўнікамі Крымскага беларускага культурна-асветніцкага таварыства, нацыянальных беларускіх калектываў Крыма, спектаклі, канцэрты, кінапрэм'еры, творчыя вечары. У Блакітнай зале Рэспубліканскага краязнаўчага музея ў Сімферопалі адкрыецца выстаўка "Мастацтва і рэлігія", якая прадставіць экспанаты з фондаў Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі.

**БелТА.**

## Большасць непаўналетніх, якія адбываюць цяперашнім часам пакаранне, асуджаны за крадзеж маёмасці

Большасць з прыкладна 1800 непаўналетніх, якія адбываюць цяперашнім часам пакаранне ў выхаваўча-працоўных і папраўча-працоўных калоніях, асуджаны за крадзеж маёмасці. Паводле звестак Міністэрства ўнутраных спраў, такіх налічваецца 1038 чалавек. 170 непаўналетніх адбываюць пакаранне за рабаванне, 150 — за хуліганства, 137 — за разбой, 88 — за згвалтаванні, 70 — за наўмыснае забойства.

Большасць непаўналетніх — 723 чалавекі — асуджаны на тэрмін ад 3 да 5 гадоў. Асуджаных на тэрмін ад 1 года да 3 гадоў у калоніях знаходзіцца 698 чалавек, ад 5 да 10 гадоў — 370. 1739 непаўналетніх трапілі ў месцы пазбаўлення волі ўпершыню, 70 — другі раз. У 1997 годзе з трох выхаваўча-працоўных калоній умоўна датэрмінова былі вызвалены 617 непаўналетніх, у 1998 — 604, у студзені-маі гэтага года — 135.

**Алег САКАЛОЎ.**

Кветкі любові

# Належыць Вечнасці

### Так быў акрэслены маштаб асобы і таленту нашага вялікага суайчынніка і сучасніка Васіля Быкава на вечарыне ў гонар 75-годдзя народнага пісьменніка Беларусі

Вядучы вечара ў сталічным Доме літаратара паэт Сяргей Законнікаў, паэты Анатоль Вярцінскі і Генадзь Бураўкін, даследчыкі творчасці пісьменніка Дзмітрый Бугаёў і Міхась Тычына з сардэчнай любоўю гаварылі пра старэйшага сябра і сабрата па пяры, магутнага волата нацыянальнага духу, які здолеў так сказаць пра Беларусь і беларусаў, што яго пачулі, зразумелі і глыбока шануюць ва ўсім цывілізаваным свеце. На дзесятках моў народаў планеты ідзе да зямлян суровая і бескампрамісная праўда аб вайне і трагічнай гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Увасобленая былым франтавіком з пякучым болем і мастацкай сілай, яна глыбока западае ў сэрцы і нашых, і замежных чытачоў. Аб гэтым пераканаўча сведчыць нядаўняя трыумфальная сустрэча славутага майстра слова з прыхільнікамі яго творчасці ў Берліне. А таксама — ягоныя паездкі ў гэтыя дні па гарадах Фінляндыі, дзе па запрашэнні тамтэйшага ПЭН-цэнтра ён зараз жыве і надзвычай плённа працуе. І адтуль перадае свае шчырыя прывітанні сваім беларускім чытачам і ўсім землякам.

А душа Васіля Уладзіміравіча — заўсёды з яго роднай Беларуссю, лёс і трывогі якой ён не аддзяляе ад уласнага лёсу. І хаця так добра знаёмай усім постаці пісьменніка не было сярод сабраных у зале, здавалася, што ён тут, сярод нас, як заўжды, незвычайна сціплы, просты і таварыскі, гранічна чулы да чужых бед, вялікіх і малых.

Такі ж сціплы і па-сямейнаму цёплы, без афіцыёзнай помпы і напышлівасці — як раз "у рыфму" з характарам самога Васіля Быкава — атрымаўся і гэты вечар. Уганараваць выдатнага сына Беларусі прыйшлі тыя, хто шчыра паважае і цэніць таленавіцейшага творцу, ганарыцца ім і праходзіць з кожным яго творам этапы свайго духоўнага самаўсведамлення і ўзвышэння. Яны апынуліся тут і выступалі зусім не "от имени и по поручению", а ад сябе асабіста, выказвалі ўласныя думкі і пачуцці.

Вядомая артыстка, нястомны прапагандыст беларускай літаратуры Галіна Дзягілева чытала купалаўскі верш "Забытая скрыпка", які любіў слухаць Васіль Уладзіміравіч. Малады галасісты спявак Вячаслаў Статкевіч папрасіў дазволу экспромтам праспяваць у гонар юбіляра народныя песні, і гэта ў яго цудоўна атрымалася. Акцёр Рускага тэатра Аляксандр Ткачонак падзяліўся запаветным: як работа над роллю Петрака ў спектаклі па быкаўскай аповесці "Знак бяды" ў нечым перавярнула яго душу...

